В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Выклічнік як часціна мовы

**Выклічнік** — асобая часціна мовы, якая выражае розныя пачуцці і валявыя пабуджэнні, але не называе іх.

Сярод часцін мовы выклічнікі займаюць асобнае месца. Яны не маюць лексічнага значэння, не з'яўляюцца членамі сказа, таму не адносяцца да самастойных часцін мовы. Не служаць выклічнікі сродкамі сувязі паміж словамі, не паказваюць на залежнасць аднаго слова ад іншага, таму не ўключаюцца і ў склад службовых часцін мовы, хоць і з'яўляюцца нязменнымі, не падзяляюцца на марфемы.

Якое значэнне выражае выклічнік, вызначаецца толькі ў кантэксце, таму што ў залежнасці ад інтанацыі адзін і той жа выклічнік можа выражаць розныя пачуцці: радасць, захапленне, смутак, незадавальненне, абурэнне, дакор: О, край родны! О, такую кнігу нельга не прачытаць. О, дык ты сапраўды жывеш багата.

Выклічнікі ў сказе могуць:

1) надаваць выказванню эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку: Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы! (Я. Колас);

2) ужывацца ў значэнні іншых часцін мовы і выконваць адпаведную сінтаксічную ролю: Усе крычаць «ура»!

# Разрады выклічнікаў

Паводле паходжання

невытворныя: не суадносяцца ў сучаснай мове з іншымі часцінамі мовы: а, о, э, ох, эй, ай-я-яй, фу

вытворныя: паходзяць ад назоўнікаў: бяда, жах, божа; дзеясловаў: будзь, бывай, падумаеш; прыслоўяў: ціха, горка, далоў; займеннікаў: то-та; ці з іншых моў: баста, біс, гайда



© ТДА «Аверсэв»

2

**Паводле значэння**

- **эмацыянальныя:** выражаюць радасць, захапленне, жаль, асуджэнне, спалох, злосць, іронію і інш.: а, о, эх, фу, чорт, біс, хм, ну
- **моўнага этыкету:** выражаюць вітанне, ветлівасць, падзяку, пажаданне, просьбу і інш.: добры дзень, выбачайце, калі ласка, даруйце
- **волевыяўленчыя:** выражаюць просьбу, загад, заклік, зварот, запрашэнне і інш.: ану, гэй, э, тсс, прэч, ш-ш, вон, плі, кыш

3

**Паводле структуры**

- **простыя:** г. зн. аднаслоўныя: о, біс, ура, жах, тфу, ша, годзе
- **складаныя:** утвораныя паўтарэннем структурных частак: ай-яй, то-та, кіс-кіс, ох-ох
- **састаўныя:** з некалькіх слоў: калі ласка, добры дзень, усяго добрага

## Гукапераймальныя словы

Ад выклічнікаў неабходна адрозніваць гукапераймальныя словы. Яны не выражаюць пачуццяў, валявых пабуджэнняў, хоць гучаннем падобны да выклічнікаў. Гукапераймальныя словы перадаюць выгукі, розныя гукі і шумы:

1) чалавека: ха-ха-ха, хі-хі-хі;
2) жывёл і птушак: рох-рох, му-му, мэ-э, ку-ку, ку-ка-рэ-ку;
3) розных прадметаў: цік-так, бом-бом, буль-буль.

Гукаперайманні складаюцца з аднаго гукаспалучэння, склада ці іх паўтарэння: брр, бух, га-га-га, г-гах.

Калі гэтыя словы набываюць прадметнае значэнне, то могуць выконваць ролю таго ці іншага члена сказа, напрыклад: Пачулася адрывістае «ўп-уп-уп».



© ТДА «Аверсэў»

# Марфалагічны разбор выклічніка

## Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Марфалагічныя прыметы: нязменнае слова; разрад паводле паходжання, разрад паводле структуры, разрад паводле значэння.
3. Сінтаксічная роля ў сказе.

## Узор разбору

«Марш!» — зноў скамандаваў Мікола (І. Новікаў).

*«Марш!»* — выклічнік, выражае загад; нязменнае слова, вытворны, просты, волевыяўленчы.

У сказе выконвае ролю дапаўнення.

# Мадальныя словы

**Мадальныя словы** — гэта асобны лексіка-граматычны разрад слоў, з дапамогай якіх выражаюцца адносіны да з'яў рэчаіснасці або да ўласнага выказвання.

Гэта словы нязменныя, яны не паясняюць ніякіх іншых слоў у сказе, не служаць для сувязі слоў, не называюць прадметаў, з'яў, дзеянняў, прымет, таму не адносяцца ні да самастойных, ні да службовых часцін мовы.

Мадальныя словы маюць наступныя адметныя марфалагічныя прыметы: яны заўсёды ў нязменнай форме, не ўступаюць у сувязь з іншымі словамі ў сказе, не валодаюць намінатыўнай функцыяй, не з'яўляюцца членамі сказа.

Мадальныя словы выступаюць у сказе ў функцыі пабочных слоў: Праўда, новае жыццё наладжвалася нялёгка.

У дыялагічнай мове яны ўтвараюць непадзельныя сказы (так званыя словы-сказы):

— Антось, ты збіраешся з класам наведаць Нясвіж?

— Безумоўна!



© ТДА «Аверсэв»

Паводле значэння мадальныя словы падзяляюцца на дзве групы:

1) словы, якія выражаюць упэўненасць, перакананне, сцвярджэнне таго, пра што паведамляецца ў выказванні: безумоўна, бясспрэчна, відавочна, вядома, зразумела, канешне, несумненна, праўда, сапраўды, факт і інш.;

2) словы, якія выражаюць няўпэўненасць, меркаванне, дапушчэнне, сумненне ў тым, што паведамляецца ў выказванні: мабыць, магчыма, можа, відаць, здаецца, мусіць, напэўна і інш.

Знешне мадальныя словы суадносяцца:

1) з назоўнікамі: праўда, факт;

2) з прыметнікамі: вядома, магчыма, безумоўна, пэўна;

3) з дзеясловамі: мабыць, здаецца, можа, відаць.

Мадальнае значэнне маюць і некаторыя спалучэнні слоў: можа быць, на самай справе, само сабой зразумела і інш.

© ТДА «Аверсэв»